Цана асобнага нумару 20 гр.

Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 10 Вільня, Пятніца 13 Сакавіка 1931 г. Год VII (XV)

Беларуская Крыніца

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19) Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл. Заграніцу ўдвая даражэй.

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Навучальная перамога.

У студні месяцы, як ведама, Ліга Народаў разважала скаргі нямецкай меншасьці ў польскай Сілезіі на „гвалты, тасаваныя з боку польскіх арганізацыяў і толераваными польскімі ўладамі ў часе выбараў у Сойм". У той час, у тыднёвай нашай газэце, маючы пры тым больш блізкія нам справы, мы гэным падзеям і іх выніку не ўдзялялі належнай увагі і месца, а варты яны гэтага, як праз увагу на іх вынік і на тое, што вынік гэны яшчэ паявіцца неўзабаве на вясновай наразе тэй-жа Лігі Народаў.

Вось-жа нямецкі ўрад рашуча падтрымаў у Лізе гэтыя скаргі нямецкай меншасьці ў Польшчы—па падставе ня толькі Статуту Лігі, але і спэцыяльнай умовы (конвэнцыі), падпісанай абедзьвюма дзяржавамі, — аб узаемнай ахове меншасьцяў у падзеленай паміж імі Сілезіі. Нямеччына таму выступіла ў Лізе ўжо сама, як пакрыўджаная старана, вінавацячы Польшчу ў нарушэньні гэтай конвэнцыі.

Усе спадзяваліся нячуванай вострай палемікі ў радзе. Бо-ж нямецкая прэса зрабіла ўсё, каб прыдаць палючую вострасьць справе, зацікавіць у ей увесь сьвет. Польскія ўлады вінаваціліся ў яўнай і адкрытай ахове і азбраеньні польскіх баёвак, нават у беспасрэдным учасьці ў гвалтах над нямецкай меншасьцяй. Нямецкія газэты, на чале з органамі ўраду, пагразілі выхадам Нямеччыны з складу Лігі Нацыяў, калі яна ня дасьць нямецкай большасьці поўні сатысфакцыі за дакананыя гвалты дый не паложыць канца ім на будучыню.

Але зьбліжэньне Англіі і Францыі перад самай сэсіяй значна ахаладзіла паднятую Нямеччынай тэмпэратуру ў Лізе. Як Брыян, таксама і Гэндэрсон усьця-ж націскалі на абодвых міністраў — Нямеччыны і Польшчы, каб не падпалялі сваімі спрэчкамі да пажару і без таго ўжо страшэнна напружанага стану ў абодвых краёх...

Нямецкі міністар згадзіўся, але пад варункам, што ўсе слушныя скаргі нямецкай меншасьці будуць задаволены радай, што сіла і вага нарушанай конвэнцыі будзе цалком адбудавана і правы пакрыўджанай меншасьці забясьпечаны рэальным кантролем Лігі.

Проці такіх варункаў польскаму міністру ня можна было спраціўляцца, і ён з свайго боку патрабаваў толькі, каб „прысуд" рады не вымагаў ад Польшчы нічога нязгоднага з яе дзяржаўным сувэрэнітэтам (незалежнасьцяй) і гонарам.

Польскі міністар шчыра прызнаў, што ў польскай Сілезіі ў часе выбараў мелі месца факты гвалтаў і націску проці выбаршчыкаў, асабліва немцаў... Яшчэ больш маральна разброіў польскі міністар свайго праціўніка заявіўшы, што польскі ўрад, прызнаўшы сьцьверджаныя факты гвалтаў, гатовы, а нават прынцыпова лічыць сваім абавязкам — ня толькі пакараць усіх віноўных прыватных і ўрадавых асобаў, але і даць прырачэньне, што ніякіх нарушэньняў правоў нямецкай меншасьці больш ня будзе. Іншымі славамі, польскі дэлегат па сутнасьці абяцаў цалкам споўніць дамаганьні цэнтральнага органу нямецкай меншасьці ў Сілезіі так зв. „Фольксбунду".

Нямецкі міністар, якому ўся яго прэса дала даручэньне „прыкладна ўкараць Польшчу", трэбаваў усьця-ж, каб Рада, як сапраўдны судзьдзя, сама наказала польскаму ўраду канкрэтна, якія кары павінен ён налажыць на віноўных, а таксама — якія меры мусіць ён прыняць, каб гвараntаваць нямецкую меншасьць проці паўтарэньня гвалтаў.

Вось-жа Рада Лігі ўрэшце ад Польшчы патрэбавала, каб польскія ўлады асабліва і сумленна ахоўвалі правы нямецкай меншасьці, каб польскі ўрад палажыў канец таму незаконна прывілеяванаму палажэньню, у якім знаходзіцца ў краі Саюз Сілескіх паўстанцаў; каб польскі ўрад да наступнай майскай сэсіі паведаміў дакладна Раду, якія канкрэтныя меры ён сам прыняў ці мае прыняць дзеля выкананьня ўсіх гэтых пастановаў Рады...

Слушна заявіў у сваей канцавой прамове старшыня Рады, англійскі міністар Гэндэрсон, што (на гэты раз) Рада сапраўды споўніла свой статутовы абавязак ахоўы меншасьцяў цалкам і сумленна.

Можам толькі дадаць, што нажаль ня ўсе меншасьці маюць такіх абаронцаў і такіх „судзьдзяў" у Лізе, як меншасьць нямецкая...

Але і ўсім іншым меншасьцям трэба тутака ня злосна заздросьціць нямецкай, але шчыра радавацца яе перамозе ў ахове сваіх правоў, разумеючы, што яе перамога—ёсьць часткова перамогай усей гэтай слушнай і сьвятой і важнай для эўрапэйскага міру справы ўсіх меншасьцяў.

Але і гэтага мала: трэба нам беларусам, аднэй, дый самай слабасільнай у барацьбе за свае правы, з меншасьцяў у Польшчы, вучыцца ў нямецкай спосабаў і мэтодаў абароны нашых правоў, нават і ня маючы пакуль што такіх-жа добрых абаронцаў у Лізе.

І ў гэтай галіне трэба асабліва адзначыць і падчыркнуць, што нямецкія скаргі былі прыняты Радай таму, што былі законныя і рэчовыя; што яны пераканалі Раду таму, што былі праўдзівыя і дакумэнтальна абаснаваныя...

Усю гэту ўрэшце перамогу, якой даканаў на арэне міжнароднай „Фольксбунд", ці Саюз усяго нямецкага народу ў Сілезіі, павінен у нас узяць сабе пад развагу Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні, як адзіная ўстанова пакліканая да абароны праў беларускага народу ў Зах. Беларусі.

Сьвята Тараса Шэвчэнкі.

(У 70-я угодкі Яго сьмерці).

Ужо мінула 70 гадоў ад дня сьмерці вялікага украінскага паэта, народнага прарока Тараса Шэвчэнкі.

Патрыярх сучаснага ўкраінскага адраджэньня Тарас Шэвчэнка, паміраючы семдзесят гадоў таму, не адышоў ад свайго народу духам, а даўшы для народу „Кобзаря" заўсёды прабывае між украінцаў і сваімі кнігамі і заклікамі, як апякунчы дух вядзе Украінскі народ да тае слаўнае будучыні, якую ў сваіх несьмяротных творах прадбачыў і праракуе.

Слушна кажа сучасны паэт украінскі Ю. Шкрумеляк.

— Шчасьлівы народ, які такога сына мае
І яго запаведзь у народнай скарбніцы
Як найдаражэйшы скарб для шчасьця
ўсім хавае...

Так, шчасьлівы той народ, які такога сына мае, а яшчэ больш шчасьлівы, калі свае цэннасьці ў народнай скарбніцы — ў сваей душы народнай, як найдаражэйшы скарб хавае.

Дзень сьмерці Т. Шэвчэнкі ўкраінцы сьвяткуюць усюды, дзе толькі лёс іх закіне.

У Вільні, украінскае грамадзянства, якое становяць пераважна студэнты, так-жа не забывае аб памяці свайго слаўнага Тараса ў гадаўшчыну яго сьмерці.

7 сакавіка с. г. за прыкладам мінулых гадоў віленскія ўкраінцы ў салі „Апольлё" зладзілі ўрачыстую акадэмію, пасьвячаную памяці Тараса Шэвчэнкі. Праграму акадэміі становілі: рэфэрат, красамоўна сказаны паслом Сойму праф. Галушчынскім, прыгожы ўкраінскі хор, ігра на скрыпцы і на украінскім нацыянальным інструманце на кобзе, украінскія нацыянальныя скокі. Саля была перапоўнена публікай. Сярод беларусаў і літвіноў было ня мала і палякоў. На ўсіх прысутных украінскі вечар у часьць вялікага украінца Тараса Шэвчэнкі зрабіў не зацёртае ўражаньне.

Для нас беларусаў вернасьць украінскага грамадзянства запаведзям свайго прарока ў многіх выпадках можа паслужыць прыкладам, дык і дзеля гэтага нам трэба больш пазнаваць мінуўшчыну і сучаснасьць Украінскага народу.

Пазнаваймося-ж узаемна, паглыбляючы і закрапляючы натуральны саюз між народамі: беларускім і украінскім, які заключыла жыцьцё ў мінуўшчыне і закрапляе ў сучаснасьці.

Праўда, старэйшае грамадзянства, якое не таргуе народнымі вартасьцямі і сумленьнем, ідзе па лініі натуральнага саюзу ў супрацоўніцтве і сужыцьці братніх, беларускага і ўкраінскага народаў, але моладзь, асабліва моладзь студэнская, павінна гэты саюз паглыбляць і закрапляць праз узаемнае сужыцьцё, пазнаньне гісторыі і сучаснасьці украінскай і беларускай дзеля вялікае мэты будучыні.

п—к.

Геройскае змаганьне індыйскіх жанчын за незалежнасьць Індыі.

Змаганьне індусаў за незалежнасьць Індыі што-раз пашыраецца і паглыбляецца. Ідэя незалежнасьці, якая сьпярша была толькі сярод інтэлігенцыі, шырока распаўсюдзілася па шырокіх прасторах Індыі і паглыбілася ў зразуменьні індусаў. Ідэя незалежнасьці ахапіла ўсе працоўныя масы Індускага народу.

У барацьбе за ідэал вольнага і незалежнага жыцьця народу не астаецца бяздзейнай і індуская жанчына.

Пасьля звальненьня англійскімі ўладамі з вастрогу правадыра індускага вызвольнага руху Гандзі, абураны народ не ўспакоіўся. Народныя масы Індыі дамагаюцца свайго права на самастойнае жыцьцё далей. У гэтым змаганьні за лепшую будучыню Індускага народу не апошняе мейсца займаюць і індускія жанчыны.

Індускія жанчыны цяпер адыгрываюць ролю ў народным адраджэньні гістарычных „Трубалураў", сьпяваючы народныя індускія песьні, якімі будзяць да нацыянальнага жыцьця свой народ, прыпамінаючы аб патрэбе барацьбы за вольнае і незалежнае жыцьцё народу.

Дзеля барацьбы за вольнасьць, паўстала арганізацыя сярод індускіх жанчын. Гэная арганізацыя ўстанавіла форму прысягі для сваіх сяброў наступнага зьместу:

„Можаце загнаць нас у найцямнейшае пекла, утапіць у найглыбейшым акіяне: ня прылучымся да вас (г. зн. да Англіі) і не паддадземся вам. Сячэце нас мячамі, варыце нас у катлох кіпучай алівы, або зьдзірайце з вас жывых скуру: ніколі ані на цаль не сагнём свайго чала. Вешайце нас на шыбе-

ніцах, паліце нас на попел: не адрачомся нашай незалежнасьці."

Жанчыны, не зважаючы на забарону ангельскіх уладаў на сабраньні, зьбіраюцца і машыруюць паходамі дэмонстрацыйна, становяцца каля сьвятыняў і ня пускаюць у дамы малітваў ні мужчын ні жанчын, якія маюць вопратку з англійскіх матэр'ялаў. Ставяць вартаўнікоў — жанчын каля ангельскіх крамаў і адмаўляюць, каб ня куплялі ангельскіх тавараў. Змушаюць купцоў закрываць свой гандаль; некаторыя слухаюць іх і апячатаўшы свае крамы аддаюць ключы ад крамаў у камітэт жанчын і забавязываюцца не прадаваць ангельскіх тавараў, пакуль ангельскі ўрад не заключыць дагавору з Гандім.

Уласьнікі кіно-тэатраў баяцца высьвятляць ангельскага вырабу фільмы, бо індускія патрыёткі стаяць каля дзьвярэй тэатраў і нагаварываюць людзей, каб ня йшлі ў ангельскі тэатр, а лепш ішлі дамоў і падумалі, як памагчы краю вызваліцца. У мяйсцовасьцях сольных жанчыны—індускі выварываюць соль супроць забароны ангельскага манаполю.

Чэсьць і слава індускім жанчынам-патрыёткам. Яны даюць прыклад, як трэба любіць сваю бацькаўшчыну і як трэба змагацца за вызваленьне свайго народу. Я-к

З газэт.

Сямейныя непаразуменьні.

Пагляд наш на адносіны да беларусаў, як польскай эндэцыі, так і сучаснай так званай санацыі (пілсудчыкаў) грамадзянству ведамы. На бачынах „Б. Крыніцы" выражалі мы яго ўжо няраз. Глядзім мы як на адных так і на другіх, як на аднаго поля ягадкі. Праўда, між імі ў адносінах да нас ёсьць розьніца, але розьніца няістотная, розьніца толькі тактыкі. Як санацыі, ад імя якой апошнім часам выступае п. Голувка, так і эндэцыі ідзе аб тое, каб у апошнім рэзультаце іх палітыкі беларусаў, як такіх, сьведамых сваіх народных мэтаў і маючых сваю народную беларускую культуру, палітыку і экономіку—у Польшчы ня было. Але да гэтай мэты, як санацыя, так і эндэцыя ідуць рознымі дарогамі, рознымі спосабамі. А нам ад гэтага, ведама, ані троха не лягчэй.

На пункце спрэчак аб спосабах полёнізацыі беларусаў паўстаюць у іх даволі часта пагляды, з якіх можна шмат чаго цікавага даведацца. Так напрыклад на апошняе выступленьне Голувкі у Сойме аб беларускай справе, аб чым мы ўжо пісалі ў ваднным з папярэдніх нумароў „Бел. Крыніцы", выступіў „Дзеньнік Віленскі" аж у двух артыкулах (№ 42 і 43), у якіх востра атакуе мэтоды Голувкі, як быццам не вядучыя да мэты.

Прадусім слушна „Dzien. Wilenski" вытыкае санацыі, што яна за пяць гадоў сваіх урадаў не здабылася ў справе народных меншасьцяў хоцьбы на такія законы, на якія ў сваім часе здабыўся эндэк Грабскі. Але дарма „Dzien. Wil." гэтым непакоіцца—санацыя і без адумысловых законаў робіць з беларусамі тое, што Грабскі пры помачы сваіх законаў.

Дужа так-жа неспакойны „Dz. Wil." і тым, што польская санацыя беларускай санацыі стварыла так званы „Цэнтрасаюз," на чале з Луцкевічам, Астроўскім і Акінчыцам і што гэна польская санацыя з гэтай беларускай урадовай групкай і далей фліртуе (кабжа толькі яны фліртавалі!), а якім „Dz. Wil." чамусьці не давярае (а можа зайздросьціць). Вось-жа і тут можам успакоіць „Dz. Wil.," бо ён не ўва ўсё пасьвячаны, а „начальство лучше знает." На ўсё свая пара. Так і тут. Прыдзе час і Луцкевіч з кумпаніяй ад санацыі за верную службу атрымае тое, што атрымаў Паўлюкевіч — каленам... ніжэй паясьніцы!

Характэрыстычную так-жа зацемку робіць „Dzien. Wil." аб Беларускай Хрысьціянскай Дэмократыі і аб групе Ярэміча, кажучы, што на гэтых п. Голувка ня можа мець ніякай надзеі. Вось гэта дык праўда! Такім чынам санацыі польскай астаецца далей весьці гэны грубы флірт з Луцкевічам і ягонай кумпаніяй, а „Dzien. Wil." гэтага ім няхай не зайздросьціць — выйдзе ў іх якраз тое, аб што і яму расходзіцца.

З Беларускага жыцьця.

Навуковыя лекцыі. У памешканьні Цэнтр. Ураду Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ў нядзелю 8 г. м. д-р Ст. Грынкевіч прачытаў уступ лекцыі аб Народных унівэрсытэтах. Далейшы цяг лекцыі, якая ўзбудзіла ў слухачоў вялікае зацікаўленьне, д-р Грынкевіч прачытае ў нядзелю 15 г. м. а гадзіне 4-й папаўдні.

Месяц жалобы. Беларускі Студэнскі Саюз з прычыны апошніх трагічных падзеяў у Менску, у рэзультаце якіх Я. Купала і праф. Ігнатоўскі пасягнулі на ўласнае жыцьцё, пастанавіў месяц сакавік с. г. аб'явіць месяцам жалобы і белыя студэнскія шапкі саюзу пакрыць чорнаю крэпай.

Акт абвінавачаньня за „Шлях Моладзі." Рэдактар „Шляху Моладзі" М. Пяцюкевіч і выдавец Я. Багдановіч атрымалі акт абвінавачаньня, у якім пракуратура абвінавачывае іх па 51 і 129 арт. к. к. за № 4 (14) „Шляху Моладзі." Гэту справу будзе разглядаць акружны суд.

„Чаму гэта так сталася?" Пад такім загалоўкам, як ведама ўжо, выйшла ў мінулым месяцы ў Вільні брашура Ф. Акінчыца.

На першы ўзгляд здавалася, што з разясьненьнем развалу „Грамады" і новых ар'ентацыяў яе павадыроў і кіраўнікоў выступае Ф. Акінчыц выключна сам ад сябе. Але як даведываемся, дык справа гэта сусім інакш прадстаўляецца. Успомненая брашура пакуль паказалася ў сьвет, была сьпярша прадметам разважаньня яе зьместу на адным з паседжаньняў полёнофільскага „Цэнтрасаюзу" у поўным складзе зацікаўленых асоб: — А. Луцкевіча, Астроўскага, Акінчыца і кумпаніі.

Дзеля гэтага трэба ўважаць гэтую брашуру ня толькі індывідуальным выступленьнем яе аўтара, але і ўсіх тых б. грамадаўцаў, якія зьмясьцілі ў „Народным Звоне" № 6 1930 г. адкрытае пісьмо да Б. Тарашкевіча, пытаючы яго, ці сапраўды ён, Тарашкевіч, падпісываў і ведаў аб тых адозвах, у якіх ужыты словы — „Банда Луцкевічаў, Астроўскіх, Акінчыцаў і г. д."

Але Тарашкевіч замест адказу б. сваім таварышом ад імя Рак-Міхайлоўскага, Мятлы і ад сябе падаў адкрытае пісьмо ў „Сав. Беларусі," аб якім мы ўжо пісалі, выясьняючы свой і таварышаў кірунак, а так-жа і сучасны кірунак Луцкевіча, Астроўскага і Акінчыца з кумпаніяй.

У той самы час выйшла і брашура **„Чаму гэта так сталася?"** Ф. Акінчыца, як чуваць, з апрабатай „Цэнтрасаюзу.

Словам, „Грамада" ўжо кончыла свой працэс раздваеньня: — Луцкевіч, Астроўскі, Акінчыц і кумпанія пад фірмай „Цэнтрасаюзу" стварылі новы кірунак, выразна полёнофільскі, што яшчэ раз пацьвярджае брашура **„Чаму гэта так сталася?**, а Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Мятла і таварышы пашлі выразна на службу да бальшавікоў, аб чым дакумэнтальна цьвердзіць адкрытае пісьмо Тарашкевіча ў „Сав. Беларусі."

„Жаноцкая справа." Пад такім назовам у мінулым тыдні паказалася ў сьвет беларуская часопісь, якая выдаецца жаночай арганізацыяй імені Цёткі.

Спэктакль Бел. Студ. Саюзу. Дня 7 г. м. Бел. Студ. Саюз ладзіў у салі Віленскай Беларускай гімназіі спэктакль. Адыграны сцэнічны твор „Змагары за ідэю." Дзеля таго, што ў гэты дзень і ў той самы час адбывалася ў Вільні акадэмія ў чэсьць памяці Тараса Шэвчэнкі, ладжаная украінскімі студэнтамі, віленскае беларускае грамадзянства і многа сяброў Б. С. С. было на акадэміі; на спэктаклю Бел. Студ. Саюзу было мала людзей. З гэтае прычыны, як даведываемся, спэктакль даў дэфіцыт, бо каса ледзь змагла выручыць 20зл. Пажадана, каб гэты спэктакль Б.С.С. паўтарыў у больш адпаведны час, даючы магчымасьць віленскаму беларускаму грамадзянству праглядзець сцэнічны твор „Змагары за ідэю."

Кніга аб партызанскім руху на Беларусі. У канцы 1930 г. выйшла з друку ў Празе Чэскай кніга пад назовам „Grimasy svetove valky" — успаміны атамана беларускіх партызанаў В. Разумовіча-Хмары.

Дакаціліся. Беларуска-польскія санатары, згуртаваныя каля „Бел. Звону", у апошнім нумары гэтай газэціны далі мейсца дзеля расправы з віленскай праваслаўнай кансысторыяй ведамаму Тодару Вярнікоўскаму. Аказваецца, што гэта аднаго поля ягадкі!

„Сумнае зьявішча". Тыя-ж „нашы" санатары, у тым-жа „Бел. Звоне", пад гэткім „сумным" загалоўкам выліваюць кракадылавыя сьлёзы і нападаюць на Бел. Нац. К-т за тое, што ён не паддаўся іх прапазыцыі і не пашоў на супольны з імі проціўбальшавіцкі пратэст з прычыны апошніх падзеяў у Савецкай Беларусі. Вось-жа на наш пагляд Бел. Нац. К-т зрабіў разумна, бо слабы той пратэст, над якім радзілі разам ведамыя Тодар Вярнікоўскі і Антон Луцкевіч!

З УСХОДНЯЕ БЕЛАРУСІ.

Перааргаанізацыя Беларускай Акадэміі Навук. Пасьля арыштаў выдатных беларускіх вучоных, сяброў Б. А. Н., камуністы прыступілі да перааргаанізацыі самой Бел. Акадэміі Навук.

3 сакавіка с. г. адбылося паседжаньне Савету Б. А. Н., на якім пастаноўлена перааргаанізаваць Акадэмію, датарноўваючы яе да найвузейшых рамак камуністычнага догматызму.

Пры гэтым адбыліся дадатковыя выбары сяброў Акадэміі. На прапазыцыю новага прэзыдэнта Бел. Акад. Навук Горына прыняты ў лік сяброў Б. А. Н.—Шчарбакоў (сябра ком. партыі ад 1928 г.), праф. Панкевіч (сябра ком. парт. ад 1919 г.), праф. Кедраў —Зіхман (сябра ком. парт. ад 1919 г.), праф. Нікольскі, праф. Кроль (кандыдат у сябры ком. партыі), праф. Бурстын (сябра ком. парт.), Лубяка (сябра ком. парт. ад 1917 г.), Платун (сябра ком. парт. ад 1920 г.), Рыўлін (сябра ком. парт. ад 1919 г.) і Сэрбэнта (сябра ком. партыі ад 1920 г.).

Гэтую перааргаанізацыю Беларускай Акадэміі Навук камуністы праводзяць з мэтай поўнай ліквідацыі беларускай народнай культуры.

Камуністычныя газэты, як „Зьвязда" і „Савецкая Беларусь", зьмяшчаюць сажністыя артыкулы, у якіх дамагаюцца аканчальнай ліквідацыі народнай беларускай думкі ў працах Беларускай Акадэміі Навук, трэбуючы перадачы Акадэміі пад сьцісьлы кантроль „пралетарскай грамадзкасьці." Камуністычныя газэты трэбуюць поўнага зьнішчаджэньня беларускай культуры заклікаючы — „рашуча і да канца з карэньнем выкарчаваць" беларускую культуру, а Беларускую Акадэмію Навук пераатварыць у „штаб пралетарскай навукі."

БЕЛАРУСЫ Ў ФРАНЦЫІ.

Нас паведамляюць з Парыжу, што там у мінулым месяцы паўстала беларуская арганізацыя сярод беларускіх эмігрантаў пад назовам „Хаўрус."

Гэтая арганізацыя мае на мэце аб'яднаць усіх беларусаў у Францыі. У гэтым кірунку ўжо распачата праца. „Хаўрус" у Парыжы наладзіў 2-е вячэрніх курсаў. Наш карэспандэнт піша, што праца разьвіваецца даволі шпарка. Сябры „Хаўрусу" дзейна і шчыра бяруцца за справу.

З Польшчы.

З Сойму і Сэнату. Зложаны праект зьмены констытуцыі галасамі Б.Б. проціў усяе апазыцыі і перададзены ў констытуцыйную камісію для падрабязнай апрацоўкі.

Гэты праект констытуцыі дае ўладу Прэзыдэнту такую, якой ня мае ні адзін манарх у Эўропе, а можа і ўва ўсім сьвеце. Сойм далей працуе над рожнымі ўставамі і законамі меншае вагі. Сэнат зацьвердзіў дзяржаўны бюджэт поўнасьцю, як прыняў Сойм.

Імяніны Пілсудскага. Як ведама, маршалак Пілсудскі цяпер аддыхае на востраве Мадэра. На дзень сваіх імянін 19 г. м. такжа ня прыедзе ў Польшчу. Дзеля гэтага з Польшчы маюцца пасылаць Пілсудскаму паздраўленьні з імянінамі поштай на Мадэру. З гэтае прычыны надрукавана множства адкрытак з фатаграфіяй Пілсудскага, якія будуць пасылацца на Мадэру. Газэты падаюць, што школьныя ўлады выдалі загад, у якім прыпамінаюць вучыцялём аб імянінах Пілсудскага, выражаючы надзею, што ня будзе аніводнага вучыцеля і вучня, якія не пашлюць Пілсудскаму паздраўленьня. З

прычыны гэтае апазыцыйныя паслы падалі ў Сойм інтэрпэляцыю з дамаганьнем, каб у высыланьні гэтых паздраўленьняў ня было прымусу.

Флірт Б.Б. да украінцаў. Газэты падаюць, што прадстаўнікі Б.Б. наладзілі перагаворы з украінскімі пасламі аб аўтаноміі для Украіны. Але гэтыя перагаворы прарваны, бо прадстаўнікі Б.Б. сьпярша зажадалі ад украінцаў дэклярацыі аб лёяльнасьці да польскай дзяржавы і адкліканьня скаргаў, якія украінцы падалі ў Лігу Народаў.

З заграніцы.

Рэвалюцыйны рух у Індыі зьліквідаваны. У апошнія часы правадыр індыйскіх нацыяналістаў Гандзі дагаварыўся з англійскім урадам і спыніў далейшую рэвалюцыйную акцыю ў Індыі. Пры гэтым трэба адзначыць, што ангельскі ўрад пашоў на вялікія ўступкі для Індыі, згаджаючыся на многія дамаганьні індусаў.

Суд над меншавікамі. У Маскве адбыўся ў гэтым месяцы суд над меншавікамі. Суд засудзіў 9 чалавек ад 5 да 10 гадоў катаргі. Бальшавікі, судзячы быццам шкоднікаў іхняга соцыялістычнага будаўніцтва, усю вострасьць гэтага працэсу ськівавалі проціў II Інтэрнацыяналу. Маскоўскія дыктатары закідаюць, што ён імкнецца да выкліканьня паўстаньня ў С.С.Р.Р. і да інтэрвэнцыі капіталістычных дзяржаў.

Вэнская газэта „Арбайтэр цайтунг", абгаварываючы гэты працэс, цьвердзіць, што работніцкая кляса Эўропы ведае, што сёлетні год будзе для бальшавікоў нешчасьлівы. Няўдача „пяцігодкі" можа выклікаць хатнюю вайну ў С.С.Р.Р. і вайну ў ва ўсім сьвеце, а разам з гэтым і контр-рэвалюцыю ў С.С.Р.Р.

Колькі Англія выдае грошай на армію. Вайсковы бюджэт Англіі на 1931 г. налічае — 39.930 000 фунтаў штэрлінгаў. Лік арміі — 148.000 асоб, апрача войска, якое знаходзіцца ў Індыі — больш 70 тысячная армія. На патрэбы авіяцыі (лятунства) вызначана 18.100 000 фун. штэрлінгаў.

З краю

УТАНУЎ У СЬНЕГ. У в. Горкі, Палянскай гм. Ашмянскага пав. здарыўся жудасны выпадак. На дварышчы забаўляўся ў сьнежкі 4-гадовы хлопчык, каторы кідаючы сьнежку ўваліўся ў гурбу сьнегу і пакуль яго з гурбы выцягнулі, задушыўся.

БАПТЫСТАМ НЕ УДАЕЦЦА. Надовячы ў Дукштах „апосталы" баптызму склікалі людзей і пачалі тлумачыць сваю веру. Падчас гэтай „навукі" людзі пачалі сьвістаць, а нехта сыпнуў кіхачны парашок. Прысутныя пачалі чхаць і парасходзіліся.

ЦЯГНІК НАЕХАЎ НА ФУРМАНКУ. Каля Смаргонь, на пераезьдзе, 2. III. с. г. цягнік наскочыў на праяжджаючую фурманку. У выніку гэтага адна асоба забіта і дзьве цяжка ранены.

Усячына.

ВЕСТКІ АБ ГОЛАДЗЕ У РАСЕІ. Надовячы ў Стоўпцах з цягніка, які прыбыў з Расеі, выйшла на вакзал жанчына з 7-гадовым хлопчыкам. Падышоўшы да буфэту, неадважна запытала, ці можа купіць яды колькі хоча. Пачуўшы адказ, што можа купляць і есьці колькі душа прымае, жанчына пачала плакаць, а пад'еўшы дасыта і накарміўшы хлопчыка, пачала расказываць. Хлеб у Расеі прадаецца толькі па картачках, па 15 фунтаў у месяц на асобу. На вёсках ад сялян адабрана ўсё збожжа і бульба. Сяляне на пражыцьцё сваіх сем'яў атрымліваюць з коопэратываў „паёк", які выдаецца так-жа па картках, па 15 фунтаў мукі і па 1 пудзе бульбы для працоўнай асобы на месяц.

ПАДЗЕЛ ЛЮДЗКАСЬЦІ НА РЭЛІГІІ. Паводле аблічэньняў людзкасьць усяго сьвету дзеліцца рэлігійна наступным лікам: 352 мільёны каталікоў, 304 мільёны прыхільнікаў Конфуцыя, 240 мільёнаў магамэтан, 224 мільёны індусаў, 164 мільёны пратэстантаў, 140 мільёнаў буддыстаў, 137 мільёнаў праваслаўных, 122 мільёны паган, 16 мільёнаў шантаістаў, 16 мільёнаў жыдоў і 76 мільёнаў людзей неакрэсьленай рэлігіі.

ЗЕМЛЕТРАСЕНЬНЕ. Дня 7 г. м. на Балканах многія мясцовасьці навясьціла землетрасеньне. Землетрасеньне трывала 12 сэкундаў і прычыніла вялікія матэрыяльныя шкоды. Зьгінула так-жа і многа людзей.

16, 17 і 18 гэтага месяца ў касьцеле сьв. Мікалая ў Вільні, а г. 5 па паўдні будуць адбывацца рэколекцыі для беларусаў каталікоў.

Да нас пішуць.

АД „КРАСНАГА ЗНАМЕНІ ДА БЕЛАГА АРЛА".

Палесьсе, Вялейскага пав. Як ведама ўсім, у „Грамадзе" ня было сапраўднага беларускага духу. „Грамада" ня мела так-жа сапраўднай беларускай ідэолёгіі. Аб гэтым сьведчаць факты пасьля яе развалу. Ні адзін сябра бышай „Грамады" пасьля яе разгрому не астаўся верным беларускай справе. Павадыры „Грамады" — Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Мятла з таварышамі пайшлі служыць ворагам беларускага Народу — бальшавіком, а Луцкевіч, Астроўскі, Акінчыц з другімі б. грамадаўцамі залажылі новую, пасьля Паўлюкевіча, Умястоўскага і Вярнікоўскага, полёнофільскую крамку „Цэнтрасаюз".

Гэта так падзяліліся самыя павадыры „Грамады". Таксама разьляцеліся хто ў свой бок і нізы – тыя сябры „Грамады", якія станавілі калісь „моц і сілу" грамадаўскага „гіганта" на гліняных нагах.

Статысты, якія былі сілай „Грамады" лікам сваіх галоў, не паслухалі цяпер сваіх колішніх павадыроў і не забаўляюцца ў эволюцыю ў падарожы ад „краснаго знамені да белага арла", як гэта робяць бышыя іх павадыры пад фірмай „Цэнтрасаюзу", а больш сьмела і адкрыта, „радыкальна" і адразу закладаюць польскія „Колы Млодзежы".

Гэткі факт можа кожны праверыць у нашай вёсцы, дзе б. грамадаўцы дня 1 гэтага месяца залажылі польскую арганізацыю „Кулко Млодзежы".

Гэткія пераскокі робяць толькі безідэйныя б. грамадаўцы, як у вярхох так і ў нізох.

Сапраўдна — патрыятычнае беларускае грамадзянства як было, так ёсьць верным беларускаму ідэалу. Гэта мы бачым у Цэнтры, гэтак ёсьць і на вёсцы.

У нашай вёсцы ўжо некалькі гадоў існуе гурток Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, сябры якога такіх пераскокаў, як гэта робяць б. грамадаўцы, нават стыдаюцца. Дык няхай скачуць грамадаўскія скакуны, але нам з імі не па дарозе. Ад іхняга скаканьня няма карысьці нікому. Няма так-жа страты і для беларусаў.

Палескі.

КЕПСКІ АБАРОНЦА БЕЛАРУСКАЕ СПРАВЫ.

Цяцеркі, Браслаўскага пав. На вёсцы каля нас даведваюцца людзі, што абаронцам беларускае справы ў Сойме выступае пасол з Б. Б. (адзінкі) нейкі пан Голувка. Сяляне, якія цікавяцца палітыкай, пачалі сьлядзіць за абаронай п. Голувкі. Сьпярша думалі некаторыя, што і сапраўды п. Голувка ў Сойме бароніць беларускае справы, але ўжо цяпер пракаваліся, як пасол з „адзінкі" трэктуе беларускую справу.

Пан Голувка, як даведываемся з газэт, цьвердзіў, што беларусы ня хочуць беларускае школы. Вось гэта дык няпраўда. Відаць п. Голувка або ня знае беларусаў, або ня хоча аб нас казаць у Сойме праўды. Калі п. Голувка ня ведае таго, што беларусы ў дамаганьні сваей роднай беларускай школы паабівалі парогі ў гміне, каб пасьведчыць школьныя дэклярацыі, дык няхай аб гэтым запытае ў Ёдзкага войта. Ёдзкі войт, які хіба ня меншы „прыяцель" беларусаў ад п. Голувкі, з дэклярацыямі на школу беларускую ня мала меў клопату. То-ж бывала людзі проста валам валілі ў гміну, каб войт пацьвердзіў іх подпісы на дэклярацыях на беларускую школу. Хадзілі ня толькі раз, а па некалькі разоў за 12 і больш вёрст, каб толькі дабіцца сваей роднай беларускай школы. А калі гэтага нашым людцам не ўдалося дабіцца, пан Голувка пасол з слаўнай „адзінкі"—кажа ў Сойме, што беларусы ня хочуць беларускай школы. Цяцерскі.

ПАСЬЛЯ БЕЛАРУСКАГА ПРАДСТАЎЛЕНЬНЯ.

Алешкі, Будслаўскай гм., Вялейскага пав. Дня 17 II. с. г. адбылося ў нас беларускае прадстаўленьне. Пасьля прадстаўленьня зьявіўся ў нашу вёску паліцэйскі ў справах службовых. Зайшоўшы ў тую хату, дзе адбывалася беларускае прадстаўленьне, заявіў гаспадару: — „Бялорускон културэн управяць умеш... для чэго сьнегу ад ганку чысто не адваліл... гдзе маш устэмп". Паглядзеўшы, адазваўся — „Тэрас пшыпомінам, а другі раз за вшыстко бэндзе протокул".

Тасьля гэтага пачаў распытываць: хто быў арганізатарам беларускага прадстаўленьня, хто наймаў кватэру, хто і колькі заплаціў. Словам, уся гутарка паліцэйскага паказвае, што ня надта мілым вокам глядзеў ён на праяву беларускай культуры.

Моладзь наша аднак на гэта не зьвяртае ўвагі і зьбіраецца зладзіць другое беларускае прадстаўленьне.

Алешкаўскі.

ЦАРКОЎНЫЯ ХЛОПАТЫ.

Узьменск, Браслаўскага пав. Нашы людзі моцна рэлігійныя і ахвотна ходзяць у цэркву. Адна бяда, што ня могуць добра зладзіць з сьвяшчэньнікам. Добры сьвяшчэньнік на вёсцы — гэта без цаны асоба. Сьвяшчэньнік павінен пашыраць асьвету і павінен радзіць людзям у бядзе. На жаль, у нашай старонцы ня так вядзецца. У нас сьвяшчэньнікі часта ня што іншае, як толькі чыноўнікі царкоўнай інстытуцыі. Яны пераважна расейцы і ад іх чуецца часта маскоўскі дух. Некаторыя дык нават гатовы прыхіліцца і да польшчыны. Нашыя духоўныя пастыры, ня маючы духовай сувязі з народам, становяцца сухімі чыноўнікамі царквы і выконываюць свае пастырскія абавязкі па казённаму. Сьвяшчэньнік такі не ўваходзіць у палажэньне сваіх парахвіян і знае адно — давай яму, што ён хоча за паслугі рэлігійныя.

Гэтак ёсьць і ў нашай парахвіі. Сьвяшчэньнік за паслугі царкоўныя бярэ дорага, а парахвіяне на яго наракаюць. З прычыны такіх адносінаў сьвяшчэньніка да прыхажан, а прыхажан да сьвяшчэньніка, некаторыя нашыя праваслаўныя пачынаюць гутарыць аб Уніі. Многія ўжо гавораць, што трэба некуды пісаць прашэньне, каб прыслалі да нас сьвяшчэньніка ўніята.

Стары падпішчык.

КЕПСКАЕ РАЗУМЕНЬНЕ РЭЛІГІІ.

Сьвіслач, Ваўкавыскага пав. У нас насельніцтва беларускае. Па веры: — праваслаўныя і каталікі. Праваслаўныя называюць сваю веру рускай, а каталікі польскай. Гэтае разуменьне рэлігіі зьяўляецца выпладам русыфікацыйнай палітыкі расейскай і полёнізацыйнай польскай.

Думаю, што такое паняцьце аб рэлігіі ёсьць некарысным як для праваслаўнай царквы таксама і для каталіцкага касьцёла, а для народу беларускага вельмі шкоднае. Трэба ведаць, што няма веры рускай, як няма і веры польскай, а ёсьць рэлігія праваслаўная і каталіцкая. Наш-жа народ ёсьць па нацыянальнасьці беларускі, якога адна часьць вызнае рэлігію праваслаўную, а другая рэлігію каталіцкую.

Праўда, сярод нашых беларусаў няма антаганізму на грунце чыста рэлігійным, а толькі сям-там можна пачуць антаганізм чужацкіх уплываў — рускія з польскімі.

Браты, мы ня рускія і не палякі, а мы **беларусы**. Дык усьведамляймося нацыянальна, а гэтыя непатрэбныя, шкодныя і нам чужыя сваркі — рускія з польскімі — прападуць самі. Мы як каталікі, так і праваслаўныя становім адну беларускую сям'ю, дык нам і сварыцца за чужыя справы ня трэба. Каб гэтых сварак ня было, мы павінны ведаць, што мы беларусы. М. Л.

САМАЎРАД НЯ МОЖА БЫЦЬ САМАВОЛЯЙ.

Гірычы, Наваградзкага пав. Добры самаўрад — гэта лад, парадак і найлепшы дзейнік узгадаваўчы ў грамадзкасьці. Адна бяда, што ў нас з самаўраду робяць нейкую качаргу толькі дзеля выграбаньня падаткаў. Апрача гэтага самаўрад наш цалком залежны, адносна пэрсанальнага складу, ад адміністрацыйнага старасты.

Дзеля таго, што войт і солтысы падлягаюць пасьля выбараў яшчэ зацьверджаньню старасты, ня раз бывае, што голас выбаршчыкаў гмінных самаўрадавых чыноўнікаў нічога ня значыць. З гэтае прычыны, гмінныя самаўрадавыя чыноўнікі часта бываюць чы-

081530

ста адміністрацыйнага характару і вічуць ня рожняцца ад паліцыі. Такія самаўрадаўцы, маючы паддзержку толькі з боку адміністрацыйнай улады і маючы прад сабою апазыцыйна настроены да сябе народ, выконываюць свае самаўрадавыя чыннасьці.

Дзякуючы такім адносінам часта мы сустракаемся з рознага роду пахібамі ў нашых самаўрадах. Прыкладам можа служыць факт спадчыны па солтысу нашай вёскі, які быў солтысам, маючы прад сабою апазыцыйна настроеную да яго асобы грамаду. Вынік гэтага змаганьня ўсяе грамады з асобаю солтыса быў несамавітым.

Дык трэба напраўляць наш самаўрад, каб ня быў ён самаволяй.

Сьлёзнавокі.

ВЯСКОВАЯ ХРОНІКА.

Здзеньцёл, Наваградзкага пав. У вёсцы Трухановічы, Здзеньцёлскай гм., месяц таму, малатарня паламала 12-гадоваму хлапцу абедзьве нагі, які ў страшэнных муках памёр.

У в. Погіры, той-жа гм., на каталіцкія запусты ў выніку нялюдзкай забаўкі моладзі, якая апіваецца гарэлкай да няпрытомнасьці, зарэзаны нажамі 25-гадовы кавалер.

У в. Венскі, тае-ж гміны, на запусты быў у ночы пажар. Аднае гаспадаркі згарэлі ўсе будынкі, збожжа і жывёла.

Трэба ў нашай гміне пачаць культурна-прасьветную працу. Тады будзе менш зла.

С.

МЕЛЬНІК І КУРЫ.

(па Крылову),

У мельніка вада запору раз прабіла,
Вада-ж — вядома сіла.
Бяды ня знаць там млынару —
Засып ён прорву у пару.
—Млынар ўсё сьпіць. Вада булькоча,
Штораз запору далей точа.
„Гэй мельнік,
Вазі ельнік,
Даволі спаць,
Кідай пасьцель і хату,
Бярыся за лапату,
Ідзі запору папраўляць.“
А мельнік кажа: „бяда далёка,
Мой стаў, як возера глыбока,
А трэба мне вады ня мора“
Сказаў, заснуў узноў ён скора.
Вада сплыла і млын спыніўся.
Тады і мельнік прабудзіўся.
Бяжыць да ставу ён хутчэй
І бачыць там сваіх курэй,
Што піць прышлі ў тую пару.
Падняўшы голаў у гару,
Яны ваду усьцяж глыталі.
Млынар крычыць: „каб вы прапалі,
Які вас чорт сюды нагнаў,
То-ж мой і так парожны стаў,
А вы рэшту выпіць захацелі,
Каб вы, пракляты, адубелі.“
Млынар страшэнна разлаваўся
І перабіў іх да адней —
І без вады і бяз курэй
Пасьля ўсяго млынар астаўся.

З.

Ab haspadarcy.

Našto arom, baranujem.

I.

Samy vierchni płast ziamli, što z hodu ŭ hod pieravaročyvajecca płuham, nazyvajecca h l e b a j. Hleba roźnicca ad hłybokich płastoŭ ziamli tym, što jana jość byccam žyvoj, u joj biazupynna adbyvajucca, ci lepš —musiać adbyvacca žyćciovyja pracesy. Heta žyćciodaŭčaja ŭłaścivaść hleby jość asnovaj usiakaha pačynańnia ŭ ziemlarobstvie. Dziakujučy hetamu i žyvaja raścina znachodzić u hlebie patrebnyja sabie: stravu (korm), vadu, pavietra da dychańnia i ciapło. Patrebnuju sabie stravu biare raścina ŭ najbolšaj miery z hleby i tolki niekatoryja raściny čaść karmavinaŭ biaruć z pavietra. Aprača taho hleba daje raścinie miesca dla raspłodu i razrostu.

Nia kožnaja adnak hleba moža dać raścinie ŭsio toje, što ad jaje vymahajecca: hlebu, katoraja daje raścinie ŭsio patrebnaje, nazyvajem hlebaj kulturnaj, a tuju hlebu, jakaja hetaha nie daje — niakulturnaj, abo i prosta — dzikoj. Padčas, kali na pieršaj rastuć raściny majučyja haspadarčuju vartaść, na dzikoj hlebie raście tolki biascennaje, a navat škodnaje zielle. Jasna z hetaha, što hleba hlebie niaroŭnaja, a navuka pakazała, što pryčyna hetaj niaroŭnaści lažyć u budovie samoj hleby, jakaja nia jość niečym naskroź sucelnym, a składajecca raz z bolšych, druhi raz z mienšych sučastak, byccam ziarniatak ziamli. Zaležna ad taho, jak hetyja ziarniatki byvajuć ułožany, budova hleby jość abo źbitaj— ziarniatki hleby ŭłožany kožnaje paasobku, — abo ziarnistaj — paasobnyja ziarniatki zaŭsiody pa try-čatyry razam tvorać asobnyja drubočki, małyja hrudki. Kab adkazać na pytańnie, katoraja budova hleby, źbitaja ci ziarnistaja, bolš i lepš zdavalaje patreby haspadarčaj raściny, pryhledźmosia na chvilinu, što dzieicca ŭ hlebie źbitaj i što ŭ ziarnistaj, a pieradusim, čamu budova hleby naahuł jość važnaj dla samoj uradžajnaści?

Zadańniem hleby, jak užo skazana, jość dadavańnie raścinie patrebnaha kormu, znachodziačahasia ŭ hlebie ŭ stanie suchim. Raścina adnak niazdolna karystać z karmavinaŭ suchich i musić ich mieć raspuščanymi ŭ vadzie. Jasnym paśla hetaha budzie, što hleby nia majučyja dosyć vady, nia mohuć być uradžajnymi, bo nia mohuć biez vady vykarystać svaich karmovych zapasaŭ, choćby ich mieli niaviedama kolki. Adpaviednaja kolkaść vady ŭ hlebie jość kaniečnaj, ale na hetym nie kaniec: u hlebie musić być dosyć i pavietra, a ad kolkaści vady i pavietra ŭ hlebie zaleža i jejnaje ciapło i škodnaja kvasovaść. Usie pieraličanyja prymiety hleby zaležać, jak ad svajej pryčyny, ad taho, *jak zachovyvajecca danaja hleba da vady*.

U *ź b i t a j* hlebie paasobnyja ziarniatki ziamli lažać ciesna adno pry druhim i vada, datykajučysia da spodnich čaściej hetkaj hleby, chutka prasočyvajecca až navierch, jak heta bačym napr. u kusku cukru spodam zamočanym u vadzie. Dziela taho adnak, što ziarniatki hleby nie raspuskajucca ŭ vadzie, jak cukar, — vada, biazupynna prasočyvajučysia ŭvierch, tvoryć z časam u źbitaj hlebie vielmi cienkija trubački, h. zv. kapilary, łučačyja spod hleby z vierchem. Hetymi trubačkami, kapilarami, vada vielmi šparka vychodzić na vierch, vyparyvajecca, hetaksama, jak knot u haručaj lampie vyciahuje nawierch karasinu, ci alivu. Źbitaja hleba, šparka vydajučaja vadu zyspadu ŭvierch, amal susiom nie prapuskaje vady źvierchu ŭsiaredzinu, a ciesna lažačyja ziarniatki hleby pakidajuć vielmi mała miejsca dla pavietra, tak, što raściny ŭ takoj hlebie zvyčajna zadychajucca.

Susiom inakš pradstaŭlajecca sprava ŭ *z i a r n i s t y c h* hlebach. Tut paasobnyja drubočki hleby, budučy bolšymi, nia mohuć hetak ciesna da siabie prylahać i tamu ŭ takoj hlebie nia mohuć vytvarycca kapilary, katorymi vohkaść vyparyvałasia-b. Zatoje źvierchu ŭniz u takoj hlebie vada vielmi lohka, byccam praz rešata, prasočyvajecca i hleba hetkaja zdolna vykarystać najmienšyja atmosferyčnyja vopadzi (doždž), usysajučy ich u siabie, u toj čas, jak pry źbitaści hleby daždžovaja vada, nia mohučy prasočyvacca, zvyčajna biezkarysna adpłyvaje. Bolšyja prastory pamiž paasobnymi drubočkami hleby dajuć dosyć miejsca na pavietra, jakoje hlebu dobra i chutka abahravaje.

Jość jašče šmat i šmat inšych pryčyn śćviardžajučych piaršynstvo hleby z budovaj ziarnistaj, prad hlebaj źbitaj. Ale i hetaha chopić. Treba tolki zaznačyć, što budova hleby nia jość niečym stałym: jana vielmi pieramiennaja i pakinienaja sama sabie mianiajecca pieravažna, ad ziarnistaści da źbitaści. U intaresie čałavieka adnak jość, kab hetyja pieramieny adbyvalisia jakraz u advarotnym kirunku: ad źbitaści da ziarnistaści i kab ziarnistuju budovu hleby, raz zaviedzienuju, biazupynna padtrymlivać.

Jak pieramiena budovy hleby z źbitaj u ziarnistuju, tak i padtrymlivańnie ŭžo isnujučaj ziarnistaj budovy hleby, nia moža abyjścisia biaz pomačy čałavieka-ziemlaroba. Hetu pomač hlebie čałaviek składaje ŭ postaci pracy z vałačyłam (vałokaj), z baranoj ci spranžynoŭkaj i z płuham. (Dalej budzie).

Inž. A. K.

УКРАІНСКІ СТУДЭНСКІ САЮЗ У. С. Б.
ладзіць
Паніхіду
у 70-я ўгодкі сьмерці
Тараса Шэвчэнкі
Ў царкве сьв. Духа, у нядзелю 15 г. м. а г. 13-ай

Instrukcyja Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury.

11. Stasawańnie štučnych hnajoŭ.

Štučnyja hnai wielmi karysny dla ziemlarobstwa. Pažadana kab hurtok kupiŭ štučnyja hnai i dzialiŭ ich siarod sialan. Dla or'jentacyi padajom prybliznyja ceny na štučnyja hnai:

1. Tamasaŭ šlak (Tamasoŭka) — 25 zł.
2. Superfasfat 16 prac. . . . — 20 zł.
3. Čylijskaja salitra . . . . — 66 zł.
4. Kalijnyja (patašewyja) soli (kajnit) . . . . . . — 8 zł.

Ceny za 6 pudoŭ u 1930 h.

Kali sialanie zachočuć paprabawać štučnaha hnoju, to hurtok pawinien zrabić zapiś, chto kolki choča kupić i jakoha hnoju i biare zadatak z kožnaha ŭ sumie paławiny wartaści zakazu. Pierad tym, jak brać zadatak, treba, kab hurtki napisali ŭ Centralu, kolki i jakoha nawozu hurtok patrabuje. Tolki tady, jak Centrala dašć adkaz i padašć ceny možna brać zadatak, jaki treba pierasłać u Centralu.

12. Jurydyčnyja parady.

Usim sialanam hurtok moža dawać praŭnyja parady. Kali hurtok čaho sam nia wiedaje, to zapisywaje sprawu i źwiartajecca ŭ Centralu. Kožny, chto choča atrymać paradu, pawinien zapisacca ŭ siabry i zapłacić hadawuju składku. Nie siabrom abo nieapłaciŭšym hadawuju składku, parady nie dajucca.

U źwiazku z paradaj, abo i biez parady hurtok maje prawa pisać usim interesantam zajawy i prośby da ŭładaŭ i prywatnych instytucyjaŭ.

U źwiazku z parcelacyjaj ziamli, łučeńnia hruntaŭ i likwid. serwitutaŭ, hurtok moža źwiartacca da ziemskaha kamisara z prośbami i prapazycyjami. Toje samaje možna rabić u sprawie samaŭradaŭ. Adnak u padobnych sprawaŭ najlepš treba pisać u Centralu, jakaja sama zrobić zachady.

13. Praca ŭ samaŭradach.

Dobryja samaŭrady majuć wialikaje značeńnie dla kraju. Pažadana, kab u samaŭrady byli wybirany najlepšyja miascowyja siły. Kab samaŭrady mahli haspadarča i kulturna raźwiwać kraj, treba, kab hurtki Instytutu pamahali pracawać samaŭradam. Heta mahčyma tolki tady, kali ŭ samaŭradach buduć swaje sprawiadliwyja i razumnyja ludzi. Dziela hetaha pry wybarach u samaŭrady hurtki pawinny wystaŭlać swaich kandydataŭ i staracca prawiaści ich. Kali-b samaŭrady nia dobra wiali pracu, abo rabili niesprawiadliwaści, hurtki pawinny danasić ab hetym u Centralu, jakaja budzie rabić zachady z metaj spynieńnia błahoha.

14. Źbirańnie statystyčnych danych.

Wielmi ważnaj rečaj źjaŭlajucca statystyčnyja danyja ab našym krai. Tut mohuć być padawany ličby z roznych halin žyćcia:

ab haspadarcy: lik ziamli ŭ sialan, lik žywioły, stan uradžaju, jakija padatki i kolki;

ab nasialeńni: lik Biełarusaŭ i inšych nacyjanalnaściaŭ i h. d.;

ab aświecie: lik škoł i jakija škoły i h. d.

Kalib Instytut pastanawiŭ sabrać statystyčnyja danyja z peŭnaj haliny žyćcia, to hurtki pawinny pryłažyć swaju pracu da taho, kab sabrać hetyja patrebnyja danyja. U hetym wypadku byli-b razasłany asobnyja ankiety, jakija zapaŭnialisia-b hurtkami.

15. Inšaja praca Instytutu.

Hurtok maje prawa wiaści ŭsialakuju pracu, što jość u statucie Instytutu (Hladzi § 4 i 5 Statutu).

Dobra było-b tak-ža zapiswać i źbirać bieł. narodnyja pieśni, kazki i prykazki, tolki treba źwiarnuć uwahu na takija rečy: kab hetyja narodnyja twory byli sapraŭdy biełaruskija (a nia čužyja, napr. rasiejskija) i kab zapiswać tak, jak ludzi haworać, nie źmianiajučy ani słowa. Pry zapiswańni treba adznačyć, dzie była zapisana pieśnia (wioska, hmina, pawiet) i ad kaho.

Za padrabiaznymi infarmacyjami ŭ kožnaj sprawie možna źwiartacca ŭ Centralu Instytutu.

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец Янка Шутовіч